# ПАВАЖАНЫЯ ВЫПУСКНІКІ!

На экзамене па беларускай мове вам прапаноўваецца напісаць пераказ, які дазволіць праверыць розныя бакі вашай моўнай і маўленчай падрыхтоўкі.

Для паспяховага напісання экзаменацыйнай работы вам рэкамендуецца наступны парадак дзеянняў:

- уважліва праслухайце тэкст і вызначце асноўную думку;
- падумайце, да якога стылю мовы і тыпу маўлення належыць тэкст;
- абавязкова складзіце рабочы план пераказу;
- абазначце для сябе, якія моўныя сродкі найбольш неабходны для раскрыцця асноўнай думкі;
- аднавіце ў памяці тэкст з улікам стылю, тэмы, асноўнай думкі, тыпу маўлення;
- пры напісанні чарнавога варыянта памятайце пра пабудову тэксту, яго лагічнасць, дакладнасць, паслядоўнасць, пра лексічнае і сінтаксічнае багацце мовы, не скажайце факты, плаўна пераходзьце ад адной часткі да другой;
- прачытайце чарнавы варыянт і падумайце, ці неабходна ўнесці дапаўненні ў змест і выкарыстаць больш удалыя моўныя сродкі, ці трэба недзе перабудаваць сказы, каб пазбегнуць беднасці і аднастайнасці канструкцый;
- праверце пераказ з улікам арфаграфічных і пунктуацыйных нормаў;
- прыступайце да чыставога варыянта пераказу.

**ПЕРАКАЗ АЦЭНЬВАЕЦЦА ДЗВЮМА АДЗНАКАМІ:**
**ПЕРШАЯ** – за змест і камунікатыўныя веды;
**ДРУГАЯ** – за моўныя, арфаграфічныя, пунктуацыйныя навыкі.

**ПЕРАД ЭКЗАМЕНАМ СУПАКОЙЦЕСЯ, НЕ ХВАЛЮЙЦЕСЯ, УСЮ ЎВАГУ ЗВЯРНІЦЕ НА ТЭКСТ, НА ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫ БОК ВЫКАЗВАННЯ.**

**НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ Ў НАПІСАННІ ПЕРАКАЗУ!**

**ВЕЛЬМІ ЎВАЖЛІВА ПРАВЕРЦЕ СВОЙ ЧЫСТАВЫ ВАРЫЯНТ!**

**ПОСПЕХУ ВАМ!!!**